Авторская мысль в “Последней пасторали” движется по замкнутому кругу, и эта особенность является характерной для параболы, понятие которой в современном литературоведении употребляется наряду с термином притча и обозначает в широком смысле условные, субъективные формы как проявление интеллектуализма в литературе. История дуэли, казалось бы нарушающая логику событий в изображенной пограничной ситуации, в действительности стыкуется как со сценами ядерной атаки, так и со всем комплексом размышлений и диалогов персонажей в произведении. Банальный роковой треугольник, по мнению главного персонажа, является для покинутых на острове (“каким-нибудь Автором какой-нибудь пьески”) способом проверить лабораторно: есть ли смысл и надежды, не кончится ли все тем же? Понятия Великого Драматурга, сцены, актеров, как бы взятые из избитой фразы о том, что “Жизнь — это театр, а люди в нем актеры”, выражают лабораторный характер созданного на основе треугольника конфликта. Дуэлянты и виновники подлинно мировой драмы идут по пути женщины — лжематери из притчи Соломона, которая готова была разделить живого ребенка, лишь бы он не достался другой. Разорванным ребенком в повести А. Адамовича предстает мир, уничтоженный из-за непримиримой вражды и стремления во что бы то ни стало доказать собственную правоту.

“Последняя пастораль” — это не пророчество, не эсхатологический миф. Книга А. Адамовича, несмотря на свой трагический конец, заключает в себе не отрицательную энергию разлада и скепсиса, а учит любви к Земле, к человечеству, к жизни как высшему дару, требующему постоянной заботы со стороны каждого, кому он дан. Это произведение — предупреждение, истинный урок гуманизма, облаченный в классическую форму философской притчи.

***Литература***


1. *Адамович А*. Заглядывая в день грядущий / Ничего важнее: Современные проблемы военной прозы. М., 1985. С. 134 — 135.
2. Там же. С. 135 — 136.
3. *Адамович А*. Последняя пастораль / Хатынская повесть. Каратели. Последняя пастораль: Повести. М., 1989.
4. *Мень А*. Человечество Иисуса / Культура, Христианство, Церковь: Лекции и Беседы. М., 1997. С. 610.




*Г.Я. Адамовіч, кандыдат філалагічных навук*

## Сусветная літаратурная класіка і беларускі кантэкст

Адамовіч любіў ставіць нечаканыя пытанні — перад генераламі, філосафамі, палітыкамі. Відавочна, што на пытанні сённяшняга дня ён бы даў свае жорсткія, але добра зразумелыя адказы. Адно з “класічных” пытанняў, што я задаю ў розных аўдыторыях: настаўнікам, студэнтам, вучням, я не паспела яму задаць. Але адказ Адамовіча становіцца відавочным у святле яго мастацкай, публіцыстычнай творчасці.

Другая сусветная вайна. Перад маладым чалавекам стаіць праблема: змагацца з фашызмам або прысвяціць жыццё сваёй сям’і (дакладна, старэнькай маці), якая іншай апоры ў гэты час не мае. Гэтае пытанне малады француз задаваў розным людзям на пачатку вайны, калі на тэрыторыі Францыі вялася так званая “дзіўная вайна”, а рух Супраціўлення на чале з Дэ Голем збіраў свае гурты на тэрыторыі Англіі. Прыйшоў малады чалавек параіцца і да вядомага філосафа Сартра (чытаем пра гэта ў працы Сартра “Экзістэнцыялізм – гэта гуманізм”. З тэкстам гэтай лекцыі французскага філосафа Адамовіч пазнаёміўся раней, чым ён быў надрукаваны ў нашай краіне, — па машынапісным варыянце перакладу).

Дык змагацца з фашызмам ці ратаваць сям’ю, дзяцей, маці?..

Відавочна, наколькі востра паўстала гэтае пытанне перад кожным беларусам у гады Вялікай Айчыннай вайны. А ў беларускай літаратуры яно мае асаблівы варыянт: у маці двое дзяцей-падлеткаў. Яе абавязак як маці — клапаціцца аб выратаванні сваіх сыноў. Але шляхі, якія яна выбірае, могуць быць зусім рознымі.

Дылогія Адамовіча “Партызаны” прапануе адно вырашэнне гэтай праблемы. У Лясную Сялібу (чытай: Глушу) прыйшлі немцы. Прататып гераіні раманаў (Ганна Мітрафанаўна) ужо ў верасні 1941-га звязалася з партызанамі, а на пачатку 43-га павяла сваіх сыноў у лес, у партызаны. Баронячы сваіх, яна ратавала найперш “чужых”: ваеннапалонных, партызан, сваё роднае — зямлю, радзіму. І як сведчыць жыццё, гэты выбар, як і Ганна Міхайлаўна з дылогіі, зрабіў беларускі народ, які змагаўся з фашызмам і перамог яго. Дарэчы згадаць дасціпную мудрасць народнага



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

героя, француза Кала Бруньёна з аднайменнага твора Рамэна Ралана: “Каб выратаваць свой дом, трэба бараніць чужы”. Менавіта гэтую мудрасць: беларуса, француза, народную, агульначалавечую, планетарную выяўляе і проза, і дакументалістыка, і публіцыстыка Алеся Адамовіча.

Супрацьлеглы выбар зрабіла гераіня апавядання Васіля Быкава “Сваякі”, такая бездапаможная ў нечаканай сітуацыі і ва ўмовах “вывіхнутага веку” (калі выкарыстаць вядомы вобраз Шэкспіра “век вывіхнуўся” з трагедыі “Гамлет” і экстрапаліраваць яго праз падзяляючыя нас стагоддзі: “лячыць хваробы часу” вымушана не адно пакаленне), трагічна асуджаная на жахлівую памылку. Дзеці-падлеткі збіраюцца ў партызаны. Маці ў роспачы і адчаі не ведае, што рабіць: або пасварыцца з Яўхімам, які нібыта зманьвае яе сыноў у лес, або паскардзіцца “сваяку” — паліцаю Дразду, каб той папалохаў яе сыноў. І маці ідзе да “сваяка” — паліцая. А ў таго – п’яныя сябрукі-паліцаі. Яны хутка “дапамаглі” маці “вырашыць” яе праблему: дзеці былі расстраляныя на вачах у маці. Што застаецца жанчыне, трагічнасць лёсу якой не пакідае чытача раўнадушным? Ці не тое адзінае, што яна і зрабіла адразу: галавой ды ў студню. Зразумела, што кантэкстаў, у рэчышчы якіх можа быць прачытаны твор, шмат. Тут прапанаваны толькі адзін з варыянтаў — аналіз тыпалагічна падобнай сітуацыі: выбар героя.

Пісьменнікі выразнага гуманістычнага кірунку, Адамовіч і Быкаў, вылучаюць прыярытэт агульначалавечых каштоўнасцей: замацоўваюць — сцвярджаючы, замацоўваюць — адмаўляючы. Яны занепакоены тым, каб перад тварам “вывіхнутага веку” чалавек, нацыя, чалавецтва ўвогуле не памыліліся. І каб гэты выбар ляжаў у плоскасці “новай гуманнасці”, новай чалавечнасці, пра што неаднаразова пісаў, чаго неаднаразова патрабаваў Адамовіч ад літаратуры, уводзячы ашаламляльнае паняцце “звышлітаратура”. Не, не паняцце ашаламляльнае — наша рэчаіснасць, XX стагоддзе, чалавецтва — ашаламляльны.

Пры ўсім адрозненні экзістэнцыялізму ад іншых філасофскіх кірункаў, а “дзіўнай вайны” ад Вялікай Айчыннай, Жана Поля Сартра таксама хвалявала пытанне пра адказнасць чалавека за ўласны выбар, бо чалавек выбірае “одновременно с собой и все человечество, не может избежать чувства полной и глубокой ответственности” (“Экзистенциализм — это гуманизм” / Сумерки богов. М., 1990. С. 325). Але маладому французу ў згаданай вышэй



сітуацыі філосаф тым не менш адказаў: “Вы свободны”. У сваіх творах (напрыклад, у апавяданні “Мур”, перакладзеным на беларускую мову ў 1991 г. З. Коласам) Сартр вывучаў “чалавека свабоднага” – перад тварам яго ўласнага небыцця.

Адамовіч звяртаўся да ўсяго чалавецтва перад тварам усеагульнага небыцця. Яна (з “Апошняй пастаралі”) набывае свабоду са з’яўленнем трэцяга (пра дзіўнасць выбару ў каханні сведчыць і апавяданне Сартра “Блізкасць”, змешчанае ў зборніку “Мур”, бел. пер. 1991 г.). Але беларускі пісьменнік замацоўвае прыярытэт “адказнасці”, а не “свабоды”, паколькі сёння нельга жыць, “как прежде, вчера!” Пачуццё “рода человеческого, убежденного в своем бессмертии” — гэта было ўчора. А сёння — “каждый обязан подумать: что, если я, он — мы и есть та “сотая” особь, от действий которой все и зависит. Или она, особь эта, прерывает цепь или наоборот — передает энергию, спасительную правду дальше и, может быть, с этого момента, на этом человеке произойдет взрыв информационной, эмоциональной энергии, который поможет спасти мир”.

“Наперад ісці чалавеку гуманнаму!” — такога чалавека “выбірае” Адамовіч, каб ісці ў надыходзячае XXI стагоддзе.

Філосафы і дагэтуль спрачаюцца: што такое чалавек. Гэта істота аднабаковая: прыродная або сацыяльная, гавораць адны. Чытаем у вядомай прытчы пра Дыягена. На пытанне, што такое чалавек, Платон адказаў: двуногае без пер’я. Але, убачыўшы абшчыпанага Дыягенам пеўня, дадаў: двуногае без пер’я, што мае шырокія пазногці. Прыродны пачатак у чалавека вывучалі пісьменнікі-натуралісты. Чалавека як “человека общественного”, сацыяльна акрэсленага, па-грамадску запраграмаванага, замацоўвалі ў літаратуры прадстаўнікі сацыялістычнага рэалізму.

Чалавека як двухасабовую істоту, як сацыяльна-прыродны арганізм, разглядалі многія пісьменнікі, філосафы. Менавіта з гэтых новых на той час пазіцый такога, больш складанага, неадназначнага чалавека даследаваў беларускі філосаф і даўні сябар Адамовіча Мікалай Ігнатавіч Крукоўскі. Гэта быў адметны, гуманістычны пункт погляду, прарыў “Чайкі па імені Джанатан Лівінгстон”, прарыў да новага светабачання, які не страціў свайго значэння і да нашага часу.

Іншыя філосафы, дзеячы культуры, вылучаюць ідэю чалавека як асобы, якая складаецца з трох пачаткаў: прыроднае —



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сацыяльнае — псіхалагічнае. Яны пішуць пра неабходнасць даследаваць гэты трэці пачатак чалавека. Як філосаф, Адамовіч схіляецца да гэтай пазіцыі, у рэчышчы якой фармуецца шлях у будучыню, адчыняюцца новыя далягляды вывучэння чалавека. Між іншым, гэты шлях даўным-даўно знойдзены і замацаваны ў сусветнай літаратуры! Леў Талстой, Фёдар Міхайлавіч Дастаеўскі... Менавіта да іх імёнаў звяртаецца Адамовіч у сваіх “пошуках чалавека”, у набліжэнні да разгадкі яго таямніц. Невыпадкова ж сцвярджаў Дастаеўскі, што “человек — это тайна. И ежели будешь разгадывать ее всю жизнь, то не говори, что напрасно потерял время. Я занимаюсь этой тайной, ибо хочу быть человеком”.

Быць чалавекам... Адамовіч вывучаў “чалавека маральнага”. Менавіта такі чалавек — яго асаблівы клопат, бо, як паказала жыццё, ёсць зноў-такі два “выйсця” з гэтай “праблемы выбару”. Ёсць высокая мараль — напрыклад, мараль распуцінскіх старых, старой, якая пакідаючы хату, што будзе спаленая, прыбірае яе перад такой заўчаснай смерцю. Высокая мараль зусім непрыкметных людзей – ёю так захапляўся Алесь Адамовіч. І ёсць антымараль, разбурэнне маральнага, чалавечага пачатку асобы. Антымараль “пожегщиков”, пра каго зноў пісаў Адамовіч, чытаючы Валянціна Распуціна. Антымараль фашызму. Антымараль карнікаў... Таму невыпадкова такое абвостранае пачуццё адказнасці за чалавека ў пісьменніка, які вывучаў, даследаваў гэтую трэцюю іпастась чалавека — яго псіхалогію, мараль: “чувство любви”, “чувство ненависти”, “чувство рода”, “литература с мироощущением рода человеческого”, “психология ядерной эры”, “бункерная психология”, “чувство личной исторической ответственности“ (сознательно ставлю рядом слова: личной и исторической), “существа с психологией”, “идеей” знакомо-нацистской”, “исконно славянское чувство жалости к голодному”, “чувство жалости ...не самое высокое чувство” (вось яна: сіметрыя — асіметрыя паняццяў-пачуццяў, маралі — антымаралі). “На сколько шагов отошел, ушел от чувства сострадания к чужому горю, беде, муке, ровно на столько шагов он приблизился, опасно приблизился, к фашистской психологии...”

У Мікалая Гумілёва ў вершы “Шостае пачуццё” ёсць радкі:

Так век за веком — скоро ли, Господь? —
Под скальпелем природы и искусства
Кричит наш дух, изнемогает плоть,
Рождая орган для шестого чувства.



Здаецца, у чалавека гэтага “органа” для шостага пачуцця няма. Але ён можа нарадзіцца пры пэўных абставінах (як дакладна пра гэта сказана ў рускага паэта). Гумілёў мае на ўвазе пачуццё Бога, якое нараджаецца ў барацьбе, у пакутах. Безумоўна, гэта “орган” высокай маральнасці, высокай духоўнасці, высокай ступені адказнасці чалавека — за лёс сваіх сыноў, Радзімы, Зямлі, чалавецтва... І Алесь Адамовіч імкнуўся зрабіць так, каб у беларусаў, у людзей Зямлі змог нарадзіцца, паспеў нарадзіцца гэты “орган для шестого чувства”.

“Чалавек”, “чалавецтва” — гэтыя універсумы, мабыць, пераламляюць праз сябе ўсе астатнія: “Сусвет”, “прырода”, “цывілізацыя”, “культура”... Калі пералічваеш гэтыя паняцці, адразу згадваеш: менавіта пра гэта пісаў Алесь Адамовіч.

Паняцце “Сусвет” зусім натуральнае ў творчасці Адамовіча. Ён разважае над словамі Цыялкоўскага: “Надо идти навстречу, так сказать, космической философии... зачем все это — зачем существуют материя, растения, животные, человек и его мозг — тоже материя,— требующая ответа на вопрос: зачем все это? Зачем существует мир, Вселенная, Космос? Зачем? Зачем?”, спрабуючы з цягам часу “дадумаць да канца”: “Так в чем же если не “смысл всего”, так хотя бы смысл человеческого существования? Не в вопросе ли заключен и ответ? Не в том ли смысл появления человека на земле и во Вселенной, чтобы кто-то спрашивал. Себя и целый мир: зачем мы и все зачем? Если верно, что человек — осознавшая себя материя, свое существование осознавшая, себя увидевшая со стороны материя, так кому же кроме как человеку спрашивать: зачем? зачем? зачем?..”

“Прырода” — біясфера і наасфера, прырода нежывая і жывая даюць на гэтае пытанне адказ. Адамовіч знаходзіць такі адказ, чытаючы твор Рычарда Баха “Чайка па імені Джанатан Лівінгтон”, бо менавіта праз яго, на думку беларускага пісьменніка, адкрылася “уставшему от пессимизма человеку Запада “Чайка”, надежда”: “У Ричарда Баха совершенно другой вид энергии — для прорыва в будущее. Нравственная работа, воля к самоусовершенствованию, движимая любовью, — вот энергия, выносящая Чайку (и мысль самого автора) в совершенно новые “пределы”. Которые не за миллиардами световых лет, а здесь, рядом, с привычным бытием”. Магчыма, у гэтым можна прачытаць і адказ на пытанне пра складанасць “шестого чувства”?!



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Універсумы "цывілізацыя" і "культура" цесна звязаныя паміж сабой: калі цывілізацыя — аснова, тады культура — уток (нітка, што ідзе ў тканіне накрыж асновы), калі цывілізацыя — уток, тады культура — аснова. Архетыпам цывілізацыі называюць Праметэя, які, згодна з міфам, даў чалавеку агонь, рамёствы, навучыў розным навукам. Калі гаворым "культура", маем на ўвазе найперш "духоўную культуру", архетыпам якой з"яўляецца Арфей. Гэтыя паняцці надзвычай цікавілі Алеся Адамовіча. Але часцей за ўсё ён звязваў іх разам, а звязаўшы, пакутаваў з прычыны існавання так званых "нажніц": "Важнейшей из проблем является и вот эта — ее сегодня формулируют как "ножницы между техническим прогрессом и нравственным движением, уровнем человечества". "Ножницы", которые увидел, о которых предупреждал Лев Толстой ("по степени своего нравственного развития люди не имеют права на пользование опасной для жизни техникой"), сегодня способны перерезать самое нить жизни — на всей планете!"

Адна з асноўных прычын узнікнення "нажніц" — усё тая ж спрадвечная гісторыя "спакушэнняў" роду чалавечага, пачынаючы з біблейскіх часоў і герояў. Тройчы спакушаў Сатана Ісуса Хрыста: найперш матэрыяльным дабрабытам (але вышэй матэрыяльнага Ісус вылучыў духоўнае!), уладай — над прыродай, над чалавекам. З тых часоў прорва паміж матэрыяльным і духоўным, паміж гармоніяй і ўладай (над прыродай, над людзьмі) — гэта прорва няспынна павялічваецца.

Пра заняпад культуры, духоўнасці, маралі сведчаць і жыццёвыя рэаліі, і мастацкія творы. Так, Мікалай Бярдзяеў з горыччу зазначаў, што чалавек ужо шукае не сэнс жыцця, а матэрыяльнага дабрабыту. Уяўляючы сябе побач з Дантэ, аўтарам неўміручай "Боскай камедыі", дзе італьянскі гуманіст асудзіў звыш тысячы заганаў, беларускі паэт Максім Танк сцвярджае, што Дантэ здзівіўся б, "што з часоў апошняе вандроўкі, // У царстве ценяў // Прыбавілася столькі новых // І невядомых // Яму кругоў".

Алесь Адамовіч, разумеючы тую пагрозу небыцця, што навісла над чалавецтвам з прычыны паглыблення гэтай прорвы — "нажніц", і замацоўваючы прыярытэт "адказнасці" чалавека ў кантэксце новых рэалій, адзначаў і тыя нешматлікія, але жыццёва важныя факты, якія давалі надзею на будучае, садзейнічалі гармоніі матэрыяльнага і духоўнага, нацыянальнага і агульначалавечага, чалавека і чалавецтва, чалавека і Сусвету. "За что можно искренне



благодарить ученых, так это за технические возможности телемостов. Наша теперь роль — превратить этот канал коммуникаций в новый вид искусства. Который бы помогал человечеству родиться, т.е. стать наконец не суммой народов и стран, а единым целым". Так ад думкі пра магчымасць ліквідаваць "нажніцы" хаця б на адным прыкладзе іншага ўзроўню ўзаемаадносін паміж людзьмі, нацыямі, культурамі Адамовіч пераходзіць да фармулёўкі таго, што атрымала назву "кантэкст".

Кантэкст — гэта і сусветная літаратура ў поўным аб'ёме з арганічнай прысутнасцю, развіццём у яе межах літаратуры беларускай. Менавіта ў гэтым рэчышчы даследаваў беларускую літаратуру Алесь Адамовіч. Кантэкст — гэта і тое "атачэнне", дзе праяўляюцца сапраўдны глыбінны сэнс і канкрэтны гістарычны змест не толькі моўнай адзінкі або мастацкага вобраза, але і ўвогуле творчасці пісьменніка, таксама як і жыцця асобнага чалавека. Невыпадкова Адамовіча так хваляваў "эфект сотай малпы" ў "ядзерную эпоху" і роля кожнага з людзей за будучае чалавецтва. Таму надзвычай вялікая роля творцы ў наш "вывіхнуты век", на думку Адамовіча, прымушае таго быць "адказным" за свае кнігі, за сваю грамадзянскую пазіцыю. Кантэкст — гэта і новыя магчымасці для дыялогу паміж культурамі, нацыямі, людзьмі ў межах усяго чалавецтва і ўсёй культуры. Адамовіч імкнуўся выкарыстаць усё для ўсталявання гэтага дыялогу і прызнання таго, што толькі "гуманнасць" ёсць адзіна верны шлях, тое хемінгуэеўскае "адзіна вернае слова", на якім пабудавана і можа быць працягнута гісторыя сусветнай літаратуры, культуры, цывілізацыі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ